**Вучэбная дысцыпліна "Актуальныя праблемы навучання беларускай літаратуры ва ўстановах сярэдняй адукацыі"**

| | |
|---|---|
| **Месца дысцыпліны ў структурнай схеме адукацыйнай праграмы** | Адукацыйная праграма бакалаўрыята (агульная вышэйшая адукацыя)<br>Спецыяльнасць: 6-05 – 0232-01 "Беларуская філалогія. Прафілізацыя": літаратурна-рэдакцыйная дзейнасць: дысцыпліна спецыялізацыі<br>Дзяржаўны кампанент, модуль "Прафесійна-метадычны" |
| **Кароткі змест** | Паняцце адукацыйнай тэхналогіі. Сучасныя адукацыйныя тэхналогіі: перавагі і недахопы ўкаранення. Тэхналогія перспектыўных ліній. Французскія педагагічныя майстэрні. Праектная тэхналогія. Тэхналогія развіцця крытычнага мыслення. Модульная тэхналогія. Тэхналогія поўнага засваення. Тэхналогія навучання як вучэбнага даследавання. Дзелавая гульня як прыватны выпадак працэсуальна арыентаванай тэхналогіі навучання. Тэхналогія педагагічнага працэсу па С. Д. Шаўчэнку. Тэхналогія Н. І. Запрудскага. Тэхналогія "Перакулены клас". Тэхналогія калектыўнай мыслядзейнасці. Метад кейсаў на ўроках літаратуры. Інтэграваны ўрок. Дальтан-план. |
| **Фарміруемыя кампетэнцыі, вынікі навучання** | У выніку паспяховага засваення дысцыпліны студэнт павінен:<br>***павінен ведаць:*** – метадалагічныя асновы дысцыпліны; – структуру, змест і прынцыпы арганізацыі школьнай адукацыі па беларускай літаратуры на сучасным этапе; – актуальныя праблемы і сучасныя тэндэнцыі развіцця методыкі выкладання беларускай літаратуры; - адметнасці выкарыстання асобасна арыентаваных і інфармацыйна-камп'ютарных тэхналогій на ўроку літаратуры;<br>***павінен умець***: – прымяняць атрыманыя веды пры вырашэнні педагагічных, вучэбна-выхаваўчых і навукова-метадычных задач з улікам узроставых і індывідуальных адрозненняў вучняў; – выкарыстоўваць сучасныя метады і прыёмы навучання ў працэсе спасціжэння літаратурнага матэрыялу, ажыццяўляць кіраўніцтва мастацка-творчай і даследчай дзейнасцю вучняў; – аналізаваць і абагульняць перадавы педагагічны вопыт;<br>***павінен валодаць***: – адпаведным тэрміналагічным і паняційным апаратам; – сучаснай методыкай і метадалогіяй педагагічных даследаванняў Патрабаванні да прафесійнай **кампетэнтнасці** спецыяліста:<br>СК-24. Аналізаваць эфектыўнасць інавацыйных сродкаў, метадаў і формаў навучання беларускай мове на фоне традыцыйных методык.<br>СК-25. Рэалізоўваць у выкладчыцкай дзейнасці сучасныя методыкі навучання правільнасці маўлення.<br>СК-26. Прымяняць у прафесійнай дзейнасці веды пра актуальныя кірункі і тэхналогіі навучання беларускай літаратуры і выкарыстоўваць інавацыйныя сродкі, метады і формы навучання. |
| **Прэрэквізіты** | "Уводзіны ў літаратуразнаўства", "Методыка выкладання беларускай літаратуры" |
| **Працаёмкасць** | Агульная колькасць гадзін – 90 (3 заліковыя адзінкі); аўдыторных гадзін – 42, у тым ліку лекцыйных – 20 гадзін (з іх кантралюемая самастойная работа – 8 гадзін), практычных – 22 гадзіны. |
| **Сем., формы атэстацыі** | 6-ы семестр, тэст, залік |